УДК 327.33

*Л. У. Ляховіч*

# СССР — ФРАНЦЫЯ: КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ 80-Х ГГ. БЕЛАРУСЬ У КУЛЬТУРНЫМ АБМЕНЕ

У адным з інтэрв'ю Ф. Міттэран адзначыў: «І Талстой, і Дастаеўскі — мае найбольш любімыя пісьменнікі. Асабліва Талстой, з якім я ніколі не разлучаюся» [1].

Ёсць у Парыжы вуліца Пятра Вялікага і плошча Сталінграда, Севастопальскі бульвар і Маскоўская вуліца, руская опера на Елісейскіх палях і праваслаўны сабор А. Неўскага, плошча І. Стравінскага і вуліца С. Пракоф'ева [2]. Гэта малая частка таго, што можна сказаць пра культурную роднасць Расіі, а потым СССР і Францыі. На працягу стагоддзяў, нават пры складаных адносінах паміж дзвюма краінамі, культурныя сувязі вылучаліся асаблівай стабільнасцю.

80-я гады XX ст. характарызуюцца неадназначным і зменлівым характарам у міжнародных адносінах. Біпалярны свет падзелены на дзве пастаянна канкурыруючыя сістэмы — сацыялізм і капіталізм на чале з дзвюма звышдзяржавамі — СССР і ЗША. У гэтых умовах Францыя лавіравала, прагматычна дабіваючыся сваіх мэт, і, валодаючы ядзернай зброяй, будавала свае даволі складаныя адносіны з СССР.

Перабудова, якая так змяніла лёс савецкай дзяржавы, далейшы распад СССР і праблемы постсавецкай прасторы былі стрымана ацэнены ў Францыі. Апошняе савецкае дзесяцігоддзе цяжка назваць бязвоблачным ва ўзаемаадносінах дзвюх краін, але культурныя сувязі вытрымліваюць усе калізіі і пахаладанне ў міжнародным жыцці.

У сакавіку 1980 г. у Парыжы была падпісана праграма супрацоўніцтва паміж Саюзам савецкіх таварыстваў дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі, таварыствам «СССР — Францыя» і асацыяцыяй «Францыя — СССР». Апошняе налічвала каля 40 тысяч індывідуальных і 160 калектыўных членаў [3]. Беларускае аддзяленне таварыства «СССР — Францыя» мела кантакты больш чым з 50 дэпартаменцкімі аддзяленнямі таварыства «Францыя — СССР» [4]. Асабліва цесным было супрацоўніцтва паміж Беларускім аддзяленнем і камітэтам дэпартамента Рона. Да пачатку 80-х гг. развіваліся кантакты паміж гарадамі-пабрацімамі: Мінск — Ліён, Магілёў — Вілербан, Гомель — Клермон-Феран, Гродна — Лімож, Орша — Воз-ан-Влен, Жодзіна — Венісье.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дынамічна разгортваліся сувязі ў 1981 г. Цэнтральнай падзеяй сталі Дні Францыі ў СССР, якія прайшлі ў верасні ў Беларусі. Акрамя традыцыйных мерапрыемстваў, у БССР праводзілася насычаная культурная праграма.

З цікавасцю мінчане наведалі выстаўку ліёнскіх шаўкоў, выстаўку, прысвечанаю французскаму рэжысёру Ж. Рэнуару і дзейнасці братоў Люм'ер. У Палацы мастацтваў адбылася экспазіцыя твораў мастакоў Ронскага дэпартамента і твораў скульптара А. Занані. У сталічным кінатэатры «Масква» адкрыўся тыдзень французскага кіно. З поспехам гастралявала французская спявачка Ж. Дано і тэатр лялек «Гіньель». Нарэшце, на працягу «Дзён Францыі ў СССР» было арганізавана новае Мінскае гарадское аддзяленне таварыства «СССР — Францыя» [5].

У сваю чаргу, таварыства «Францыя — СССР» арганізавала «Дні Савецкага Саюза» з удзелам Беларусі. Французскія гледачы ўбачылі выступленні Дзяржаўнага ансамбля танца БССР, дэманстрацыі калекцыі Беларускага Дома мадэлей. У гарадах Францыі праходзілі выстаўкі беларускага нацыянальнага касцюма, графікі і кніжнай ілюстрацыі, дэманстраваліся мастацкія і дакументальныя фільмы. Адбыўся абмен дэлегацыямі ў гарадах-пабрацімах, французскія госці наведалі Магілёў, Гомель, Оршу, Барысаў. Карціну ўдзелу БССР у культурным абмене з Францыяй дапаўняе выстаўка, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння Ф. Лежэ, што адбылася ў Дзяржаўным мастацкім музеі БССР.

У тым жа 1981 г. у Дзяржаўным музеі выяўленчых мастацтваў імя А. С. Пушкіна ў Маскве адбылася грандыёзная выстаўка «Масква — Парыж», прысвечаная мастацкай культуры Францыі, Расіі і СССР першай трэці XX ст. Савецкія гледачы змаглі ўбачыць экспазіцыі «Заходнееўрапейскае дэкаратыўнае мастацтва IX—XVI ст. з музеяў Луўра і Клюні». У СССР гастралявалі французскі арганіст П. Пажанель і эстрадны аркестр Каравеллі.

У Францыі ў 1981 г. выступалі 7 савецкіх мастацкіх калектываў і 34 салісты, адбылося 244 прадстаўленні [6]. Сярод іх — гастролі балета і аркестра Ленінградскага тэатра імя Кірава, Маскоўскага камернага музычнага тэатра, на французскай сцэне быў пастаўлены «Шчаўкунчык» П. Чайкоўскага.

Штогадовымі ў Францыі сталі гастролі савецкіх музыкантаў — С. Рыхтэра, У. Ярэські, Т. Нікалаевай, Я. Малініна, В. Траццякова, У. Співакова, Л. Когана, а таксама дырыжораў У. Федасеева, Ю. Цемірканава, Э. Класава ды інш.

У 1981 г. у Парыжы адбылася прэм'ера сумеснага савецка-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

французскага фільма «Тэгеран-43» і прайшлі гастролі Б. Акуджавы, а ў СССР прайшоў Тыдзень французскага кіно.

Аналіз матэрыялаў перыядычнага друку паказвае, што ў першай палове 80-х гг. культурныя сувязі атрымалі стабільны характар і прыкметна пашырыліся ў 1984 г. у сувязі з 60-годдзем устанаўлення дыпламатычных адносін паміж краінамі [7].

У цэнтры ўвагі былі: выстаўка савецкага мастацтва ў Парыжы з нагоды сумеснага касмічнага палёту, экспазіцыі графікі, дэкаратыўнага мастацтва і народных промыслаў Беларусі, «У краіне залатога руна» (старажытнае мастацтва Грузіі), «Савецкі партрэт у жывапісе і графіцы» ды інш. У СССР прайшлі экспазіцыі «Памяці Пікасо» і «Эдуард Мане».

Значнае месца ў культурнай праграме заўсёды займала музычнае і тэатральнае мастацтва. У 1981—1984 гг. СССР наведалі вядомыя французскія выканаўцы: А. Пажанель (арган), Г. Дюссо, Ж.-Ф. Калар і Э. Флавіны (фартэпіяна) ды інш.; у 1982 г. салісты Парыжскай оперы выступалі на Ленінградскай сцэне; у СССР дырыжыравалі І. Маркевіч і Ш. Брук. Нарэшце, у 1984—1985 гг. адбыліся гастролі «Камедзі Франсэз» і «Аркестра дэ Пары». У той жа год СССР наведаў М. Легран, знакаміты французскі кампазітар.

У сваю чаргу Францыю ў 1983 г. наведалі артысты Вялікага тэатра СССР, гастраляваў Маскоўскі тэатр імя Ленінскага камсамола. Сапраўдны «рускі сезон» адбыўся ў 1984 г., калі французская публіка пазнаёмілася з рускай опернай класікай XIX ст. У той жа год у Францыі выступалі Акадэмічны аркестр СССР пад кіраўніцтвам Я. Святланава і кампазітар Дз. Кабалеўскі, вядомыя артысты А. Абразцова, І. Архіпава, К. Максімава і У. Васільеў.

Неаднаразова выязджаў у Францыю Маскоўскі цырк, у Ленінградзе пабывалі «Лялькі Філіпа Жанці». У 1984 г. у Парыжы адбылася сустрэча савецкіх і французскіх тэатральных дзеячаў з удзелам А. Арбузава, Г. Таўстаногава, Г. Баравіка ды інш.

Прыкметна ажывіліся кантакты ў галіне эстрады. У 1983 г. СССР сустрэў А. Маруані і ансамбль «Спейс», у 1984 — К. Рыбейра, у 1985 — М. Марсо. У 1982 г. у парыжскай зале «Алімпія» выступала А. Пугачова, а ў 1984 г. адбыліся гастролі Ж. Бічэўскай і Н. Брэгвадзе.

У 1982 г. прывабным для французскіх грамадзян быў беларускі ансамбль «Верасы», у 1985 г. — вечар, прысвечаны БССР і праведзены ў Парыжы Клубам рускай кнігі сакратарыята ААН.

Новы якасны змест атрымалі культурныя сувязі ў другой палове 80-х гг. У час візітаў М. С. Гарбачова ў Францыю ў лі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пені 1989 г. і ў кастрычніку 1990 г. сярод мноства падпісаных дакументаў было прынята і Пагадненне аб культурным супрацоўніцтве. Яно ахоплівала ўсе магчымыя сферы — ад архіваў да міжнароднага турызму. Прадугледжваўся абмен на камерцыйнай і некамерцыйнай аснове, стварэнне ўмоў для свабоды і адкрытасці, аслабленне цэнтралізацыі і развіццё прамых абменаў [8]. Іншая справа, наколькі ўсё гэта было рэальна, таму што ў 1991 г. СССР перастаў існаваць.

Тым не менш у 1985 г. таварыства «Францыя — СССР» узначальвалі такія вядомыя пісьменнікі, як Л. Арагон і Ф. Марыяк, а 430 мясцовых аддзяленняў дзейнічалі на ўсёй тэрыторыі Францыі [9].

Працягваюцца кантакты ў галіне літаратуры. Яшчэ ў 1983 г. у г. Бужывале пад Парыжам адкрыўся музей, прысвечаны жыццю і творчасці І. С. Тургенева. Тут, у маёнтку Ясені, ён пражыў 10 гадоў і памёр у 1883 г. У 1985 г. у Францыі было шырока адзначана 125-годдзе з дня нараджэння А. П. Чэхава. У 1987 г. былі выдадзены 2 тамы пісьмаў Л. Талстога, аповесці У. Тандракова, раманы братоў Стругацкіх, творы Ч. Айтматава ды інш. [10].

Кнігі французскіх пісьменнікаў перакладаліся на нацыянальныя мовы народаў СССР. Так, у другой палове 80-х гг. былі выдадзены на беларускай мове творы А. дэ Сент-Экзюперы, А. Камю, Ф. Марыяка, Ж. Сімянона, а ў 1987 г. у Францыю былі адпраўлены творы М. Гарэцкага і З. Бядулі.

У 1986 г. у Парыжы прайшоў тыдзень савецкай кнігі і адбыліся сустрэчы з французскімі чытачамі В. Быкава, Ю. Сямёнава, З. Багуслаўскай. Больш маштабнымі, звязанымі з праблемамі сучаснасці, сталі кантакты пісьменнікаў. Прыклад таму — «круглы стол», арганізаваны ў лютым 1989 г. Агенцтвам друку «Навіны» і часопісам «Фігаро-магазін», які быў прысвечаны праблеме ролі інтэлігенцыі ў сучасным грамадскім працэсе.

Новы змест набылі кантакты ў галіне кінамастацтва. Так, у 1986 г. было адзначана, што «савецкае кіно наступае». Гэта датычылася і прадстаўнікоў савецкай класікі — Даўжэнкі, Эйзенштэйна, Пудоўкіна, і сучасных твораў Клімава, Міхалкова, Германа ды інш. У чэрвені 1986 г. у Парыжы прайшоў буйны паказ савецкіх фільмаў 20—80-х гг., дзе дэманстравалася 50 работ [11]. У 1987 г. у Парыжы адкрыўся чарговы тыдзень савецкіх фільмаў, прысвечаных 70-годдзю Кастрычніцкай рэвалюцыі. З новых кінафільмаў у праграме былі «Ці лёгка быць маладым», «Плюмбум, або Небяспечная гульня», «Ідзі і глядзі», «Пакаянне» ды інш. У Маскве таксама быў арганізаваны рэтраспектыўны паказ 30 найбольш вядомых

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

французскіх фільмаў усіх часоў.

Дынамічна развіваўся абмен у галіне выяўленчага мастацтва, тэатра і музыкі. Адзначым найбольш адметныя падзеі.

У 1986—1987 гг. спачатку ў Парыжы, а потым у Маскве прайшла маштабная выстаўка «Францыя — Расія. Век Асветы». Яе рыхтавалі на працягу года звыш 20 музеяў, бібліятэк і архіваў абодвух краін [12]. У 1988 г. з Парыжа ў Маскву спецыяльным авіярэйсам былі адпраўлены карціны, малюнкі і графіка рускіх мастакоў Н. С. Ганчаровай (праўнучкі Н. М. Ганчаровай) і М. Ф. Ларыёнава, пражыўшых у Францыі 30 гадоў. Уся калекцыя налічвае некалькі соцень твораў [13].

У 1986—1987 гг. у СССР прыязджалі на гастролі «Камедзі Франсэз», «Аркестр дэ Пары», балет тэатра з горада Нансі. У канцы 1989 г. Р. Нурыеў, які ўзначальваў з 1983 г. балетную трупу Парыжскай оперы, танцаваў на сцэне Кіраўскага тэатра ў Ленінградзе.

У другой палове 80-х гг. у Францыі пабывалі артысты Вялікага тэатра СССР, тэатра на Таганцы, Малога тэатра, цыганскага тэатра «Рамэн» ды інш. Французы наведалі прадстаўленні Маскоўскага цырка і канцэрты ўжо добра вядомага ў Францыі ансамбля танца І. Маісеева, якога назвалі «творцай новага стылю ў харэаграфіі» [14]. У 1988 г. гастролямі МХАТа ў Парыжы адкрыўся міжнародны семінар «Стагоддзе Станіслаўскага».

Больш частымі і прадукцыйнымі сталі кантакты мадэльераў. У 1987 г. фірма «Карвен» пасля паказу сваіх мадэляў у Маскве запрасіла ў Парыж В. Зайцава. У 1988 г. французскія манекеншчыцы прадэманстравалі больш за 80 яго мадэляў, В. Зайцаву былі прысуджаны памятныя медалі і ганаровы дыплом Парыжа [15]. У 1989 г. П. Кардэн сваю калекцыю, прысвечаную 200-годдзю Французскай рэвалюцыі, паказаў у Парыжы і прывёз яе ў Маскву і Мінск. Беларусь была першай рэспублікай пасля РСФСР, якую ён наведаў. Паездка планавалася як рэкламная, аднак была дамоўленасць з Гродзенскай фабрыкай, якая будзе шыць «ад Кардэна» [16].

На працягу 1985—1991 гг. дэлегацыі параднёных гарадоў Беларусі неаднаразова выязджалі ў Францыю. Па запрашэнню аддзялення дэпартамента Рона дэлегацыя Мінска наведала Ліён у 1985 г. У 1986 г. у час прыняцця французскай дэлегацыі ў Гродна адну з вуліц назвалі імем Ліможа, а ў 1987 г. у Беларусь прыбыла турысцкая група веласіпедыстаў з Ліёна, Венісье, Вілербана і Воз-ан-Влена.

У 1986 г. адбыўся вечар Беларусі ў ААН. Асноўная ўвага была ўдзелена фільму «Ідзі і глядзі», паводле сцэнарыя

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

А. Адамовіча. У тым жа годзе ў Мінску праходзілі гастролі тэатра балета горада Нансі. Асобым поспехам карысталіся «Сімфонія рэ мажор» Й. Гайдна і «Варыяцыі на тэму з "Пятрушкі"» І. Стравінскага. У 1988 г. у парыжскай штаб-кватэры ЮНЕСКА адбылася цырымонія перадачы ў дар бібліятэцы 5-томнай «Беларускай энцыклапедыі літаратуры і мастацтва», у якой утрымліваецца больш за 15 тысяч артыкулаў [17]. У 1989 г. у Мінску прайшлі ўрачыстасці, прысвечаныя 200-годдзю Вялікай французскай рэвалюцыі. У 1990 г. у памяшканні ТЮГа ў Мінску адбыліся гастролі парыжскага тэатра «Лабрадор», а ў Парыжы — выстаўка разьбы па дрэву майстра М. Калакольцава з г. Глыбокае.

Шматлікія праяўленні «народнай дыпламатыі», «маршы міра», «акцыі», «ініцыятывы» рабілі культурнае супрацоўніцтва больш разнастайным. Так, у 1990 г. у Маскве на стадыёне ў Лужніках адбылася акцыя «Спорт супраць наркотыкаў». У Маскву прыбыла каля 200 французскіх гасцей. Сярод іх — М. Мацье, ужо наведаўшая СССР у 1987 г., С. Дзістэль, І. Абрэ.

Такім чынам, відавочна, што культурныя сувязі былі вельмі ўстойлівымі ва ўмовах няпростага міжнароднага становішча ў 80-я гг. І гэта лёгка растлумачыць, таму што імкненне пазнаць адзін аднаго, убачыць свет зразумела любому чалавеку, нягледзячы на яго палітычныя погляды.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

### *Літаратура*

1. Вопросы истории. 1994. № 1.
2. Правда. 1990. 4 апр.
3. Правда. 1980. 16 дек.
4. Советская Белоруссия. 1980. 1 апр.
5. Советская Белоруссия. 1981. 23 сент.
6. *Борисов Ю. В.* СССР — Франция: 60 лет дипломатических отношений. М. 1984. С. 209.
7. Связи между СССР и капиталистическими странами в области культуры. М., 1987.
8. Визит М. С. Горбачева во Францию. 4—5.07.1989 года — Париж; 6.07.1989 года — Страсбург: Документы и материалы. М., 1989.
9. Звязда. 1985. 3 сак.
10. Известия. 1987. 3 марта.
11. Известия. 1986. 3 июля.
12. Известия. 1986. 23 дек.
13. Известия. 1988. 12 мая.
14. Звязда. 1987. 14 сак.

15. Советская Белоруссия. 1988. 28 янв.
16. Літаратура і мастацтва. 1989. 14 ліп.
17. Советская Белоруссия. 1988. 16 дек.

*SUMMARY*

*Complexity and instability of international situation in 80-s are described — from ideological cooperation and arms race up to reorganization and disintegration of the USSR. On this fackground the cultural exchange in different fields and its quantitative pecularities in the 1st and 2nd half of 80-s are analized. Especially the role of Belarus in emphasized, the extansion of its participation in cultural exchange is shown.*

УДК 942.086

*І. Р. Чыкалава*

## ЖАНЧЫНА І ПАЛІТЫКА Ў ВЯЛІКАБРЫТАНІІ: ГІСТАРЫЧНЫ АГЛЯД

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У апошнія дзесяцігоддзі даследчыкі шырока абмяркоўваюць праблему інтэграцыі жанчын у палітычнае жыццё. Апошняя складаецца з двух элементаў: ролі, якую жанчыны выконваюць у свеце палітыкі і адваротнай ролі, якую сама палітыка адыгрывае ў іх жыцці.

Атрыманне выбарчых правоў з'яўляецца неабходнай, але, як паказвае вопыт, далёка недастатковай умовай удзелу жанчын у палітыцы, паколькі не гарантуе іх поўную інтэграцыю ў палітычны свет. Напрыклад, хаця жанчыны і скаладаюць палову электарата, яны традыцыйна слаба прадстаўлены ў нацыянальных парламентах амаль кожнага дэмакратычнага грамадства: у 1995 г. у сярэднім толькі 11,3% ад іх саставу [1]. Яны займаюць вельмі мала лідэрскіх пазіцый ва ўрадавых, прафсаюзных структурах, бізнесе (асабліва буйным). У той жа час, пакуль урады ўцягнуты ў працэс рэгулявання нараджальнасці, сексуальнасці, рэпрадукцыі, раздзялення працы і ўласнасці ў сям'і, умоў, што ствараюць або разбураюць сям'ю, без улады ў палітычным свеце жанчыны на справе не змогуць валодаць у поўнай меры ўладай у прыватным жыцці.

Калі ў канцэпцыі інтэграцыі прапануецца важнейшы аргумент, што апраўдвае ўдзел жанчын у палітыцы, то маргінальнасць іх палажэння ў грамадстве прадухіляе ўваход у яе ў вялікай колькасці. Віёла Клейн вызначае маргінальнасць як стан чалавека, які існуе адначасова ў «двух розных сусветах», «двух культурных сістэмах», адна з якіх звычайна разглядаецца як